# ПРАФЕСІЯНАЛІЗМ НЕ МАЕ ЎЗРОСТУ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

У прызначаны час званю ў кватэру непадалёку ад станцыі метро «Каменная Горка». За дзвярыма сабачы брэх. Гаспадыня трымае за ашыйнік лабрадора і запрашае ў залу.

Пачынаю сябе рэкламаваць, маўляў, не з чужых вуснаў ведаю, як выхоўваць хвастатага, даглядаць за ім, карміць, купаць. У самой сабака пражыў 15 гадоў нібы ў Бога за пазухай, не раўня пенсіянерам. Тым часам «брат наш меншы» падышоў да мяне і ўткнуў морду ў калені. Гэта вельмі здзівіла жанчыну і разам з тым узрадавала.

— Жывём мы з мужам удваіх, маем невялікі бізнес, часта ў раз'ездах. Удзяляць шмат увагі свайму любімцу не можам, — пачала шчыра гаварыць жанчына. — Ужо трэці месяц шукаю для Боркі апекуна, прыходзяць у асноўным падлеткі 16—18 гадоў. Ніводнага з іх не ўспрыняў мой гадаванец: рыкаў, кідаўся — не даверае ён чужынцам. А вы яму спадабаліся.Таму адназначна нам падыходзіце.

Тым часам мы абмяркоўвалі ўмовы работы, аплату. Сышліся на 10 доларах у гадзіну. Я нават пагадзілася выгульваць новага сябра адзін раз у тыдзень бясплатна. Ведаю, што істоты гэтай пароды вельмі непаседлівыя і любяць добра пабегаць. Ды і мне, маўляў, свежае паветра пойдзе на карысць.

Ударылі, так бы мовіць, па руках. І тут я прызналася, што паспрачалася з сяброўкай накант таго, ці лёгка ўладкавацца на працу пенсіянеру. Для Таццяны Рыгораўны гэта быў шок. Як толькі не нацкавала на мяне свайго любімца. Але, на шчасце, я пакінула кватэру жывой і здаровай.

## Нянька для дзіцяці

Нядрэнна аплачваецца і работа нянькі для дзіцяці ў прыватнікаў. Для выхавання малых таксама запрашаюць і жанчын ад 55 да 60 гадоў. У кожнага наймальніка свае патрабаванні. Напрыклад, адзін бізнесовец пацікавіўся, ці ёсць у мяне асабісты аўтамабіль, каб кожны дзень вазіць дзяцей на занняткі ў музычную школу. Бензін ён гатовы аплачваць дадаткова. Другі дапытваўся, ці маю педагагічную адукацыю і ці валодаю англійскай моваі, камп'ютарам. «У мяне была нянька, якая не ўмела нават sms на тэлефоне набраць. Чаму яна магла навучыць маіх дзяцей, у якіх ёсць айфоны, планшэты, ноўтбукі. Хіба што казку пачытаць на ноч», — прачытаў мне цэлую лекцыю аб выхаванні сучаснага падрастаючага пакалення мужчына.



— Згодна з вамі, выхоўваць дзяцей дзедаўскімі метадамі — папругай ды крыкамі, як 30—40 гадоў таму, нельга. Магуць паскардзіцца ў органы апекі нават на сваіх родных бацькоў, не тое, што на чужога чалавека, — пагаджаюся з ім. — Я не з такіх пенсіянераў: карыстаюся камп'ютарам, мабільнымі тэлефонамі, магу не толькі sms-паведамленне перадаць, але пры неабходнасці звязвацца з вамі па скайпе. А калі чаго не ведаю, то лёгка засвойваю ўсё новае.

І вось я ў свайго наймальніка, у яго шыкоўным двухпавярховым катэджы, што побач з Мінскай кальцавой дарогай. Гаспадар адразу запатрабаваў у мяне пашпарт. «Мабыць, правярыць, ці не аферыстка я», — менавіта так падумалася тады.

— Сапраўды, пенсіянерка, а так і не скажаш, — гмыкнуў ён.

Дзесьці паўгадзіны ўводзіў у курс справы. Аказалася, што акрамя догляду за дзецьмі — пяцігадовым хлопчыкам і дзяўчынкай чатырох гадоў, у мяне яшчэ шмат іншых абавязкаў. У прыватнасці, мыццё бялізны, прыборка памяшканняў, гатаванне для дзяцей іх любімых страў. Словам, два ў адным: і выхавальніца, і прыбіральшчыца, да таго ж яшчэ ненармаваны рабочы дзень. Ці не нахабства гэта, ці не рабская эксплуатацыя чужой працы? Хоць у прафсаюз звяртайся па дапамогу.

— Ды вы ж павінны і плаціць мне, як за дзве стаўкі, — асмялела я.

— Можам разгледзець варыянты бясплатнага пражывання і харчавання ў маім доме, — парыраваў мой суразмоўца. — А 900 рублёў сённяшнім часам, пагадзіцеся, нядрэнныя грошы.

Я паабяцала падумаць над яго прапановай. Думаю да гэтага часу...

## Капірайтар-раманіст

Рэальна ўладкавацца пенсіянеру і кур'ерам, расклейшчыкам рэкламы. Заробкі, праўда, невялікія. Ды ўсё ж нейкі дадатак для падтрымкі штаноў. Некаторыя фірмы аплачваюць яшчэ праезд і мабільны тэлефон.

Ёсць кампаніі, якія гатовы ўзяць пенсіянера бухгалтарам, галоўным бухгалтарам, эканамістам. Патрабаванні — уменне карыстацца ПК. Але гэтыя спецыяльнасці не для мяне — неабходна мець профільную адукацыю.

Больш як 100 аб'яў знайшлося па запыце «патрэбны капірайтар». Вакансіі даступныя не толькі для пенсіянераў, але і для людзей з інваліднасцю і нават без вышэйшай адукацыі. Работа, як правіла, дома. Галоўнае, мець свой камп'ютар, добра валодаць рускай моваі, умець пісаць артыкулы рознай тэматыкі даступна, зразумела. Зацікавіла мяне кампанія, якая патрабуе ад патэнцыйнага супрацоўніка не толькі гэтых навыкаў, але яшчэ і выдатнага ведання рускай літаратуры. І нават цікавіцца колькі кніг класікаў рускай літаратуры той прачытаў за апошнія паўгода.

— Хачу працаваць у вашай кампаніі, — тэлефаную па ўказаным нумары. І адначасова азадачваю свайго суразмоўцу: «А вы ведаеце, што напісаў Леў Талстой, а што Аляксей Талстой?»

Той прабурчаў у трубку нешта незразумелае. Але хутка ўзяў сябе ў рукі:

— Акрамя таго, цэніцца вопыт напісання артыкулаў, апавяданняў, раманаў асабістага сачынення.

— Дык апошні раз я пісала сачыненне ў школе. А пасля заканчэння факультэта журналістыкі толькі газетныя артыкулы.

— Вы прафесійны журналіст?

— Так, але ўжо на пенсіі.

— Чакаем вас заўтра ў офісе.

— А як наконт зарплаты?

— Зарплата дастойная, — супакоіў мой суразмоўца.

Дык ці патрэбны на рынку працы пенсіянеры? Сапраўдныя прафесіяналы будуць запатрабаваны заўсёды незалежна ад узросту. Але ў тым, што многія не могуць уладкавацца на работу, вінаваты перш за ўсё яны самі, паколькі не хочуць ісці ў нагу з часам, вучыцца, а калі патрэбна, то і перавучвацца, спасцігаць новыя тэхналогіі. І ў выніку прайграюць маладым. Ёсць, як высветлілася, шмат прафесій, дзе наймальнікі перавагу аддаюць вопытным спецыялістам старэйшага ўзросту. Напрыклад, у сферы навукаёмістых тэхналогій, медыцыне, бухгалтарскім уліку. Каб выпускнік стаў добрым урачом, яго трэба вучыць не адзін год. А тут майстар сваёй справы. Ад добрага, як кажуць, лепшага не шукаюць.

**Тацццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**
*lazovskaya@zviazda.by*

«ГАРАЧЫ» 287 17 41

# «Сцірты саломы размешчаны без аніякіх парушэнняў»

**З вёскі Долкінды Нясвіжскага раёна ў рэдакцыю звярнуўся Аляксандр Кандратавіч Гуліцкі. Расказаў пра тое, што літаральна побач з дамамі населенага пункта размешчана жывёлагадоўчая ферма гаспадаркі «Новае жыццё», недзе метраў за 300. Па словах заяўніка, да яе пачалі звозіць салому. У чым тут Аляксандр Кандратавіч убачыў праблему і нават небяспеку?**

— Сцірты складваюць вельмі доўгія, напэўна, метраў па 500 даўжынёй. Яны суседнічаюць вельмі шчыльна. А як, барані Божа, пажар? Да дамоў жа зусім нічога, — даводзіў нам вяскоўвец.

Каб разабрацца ў сітуацыі, мы тут жа звязаліся з начальнікам Нясвіжскага раённага аддзела па надзвычайных сітуацыях Віталем Бокунам. Той выслухаў скаргу заяўніка і папрасіў крыху часу, каб можна было ўсё праверыць з выездам на месца. Недзе праз дзве гадзіны Віталь Вячаслававіч сам звязаўся з рэдакцыяй і паведаміў наступнае.

— Мы выязджалі да Аляксандра Кандратавіча, размаўлялі з ім. Сапраўды, побач з вёскай размешчаны сцірты саломы. Аднак усё зроблена ў адпаведнасці з нормамі і правіламі пажарнай бяспекі. Калі сцірты, згодна з імі, павінны размяшчацца ад будынкаў на адлегласці не менш як 50 метраў, насамрэч яна найбліжэйшага будынка да іх 70-100 метраў. Вытрыманы і іншыя патрабаванні: ад ліній электраперадач да саломы не менш за 15 метраў. Тое ж можна сказаць і пра адлегласць да дарогі — усё адпавядае нормам і правілам, — сказаў Віталь Бокун.

Далей начальнік Нясвіжскага аддзела па надзвычайных сітуацыях дадаў, што Аляксандр Кандратавіч падчас размовы прызнаўся ў сапраўдным прычыне свайго звароту ў рэдакцыю. «Раней з акна дома ён мог бачыць аўтакраму, якая прыязджала ў вёску. А цяпер сцірты саломы замінаюць».

Праз некалькі хвілін Віталь Вячаслававіч зноў набраў нумар рэдакцыі і сказаў, што паспрабуюць дамовіцца з кіраўніцтвам гаспадаркі, каб частку саломы перанеслі ў іншае месца. Хоць, паўторымся, нікто не абавязаны гэтага рабіць, паколькі сцірты размешчаны без аніякіх парушэнняў нормаў і правілаў пажарнай бяспекі.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ

## ЗНІКЛІ І ЗНАЙШЛІСЯ

Днямі пошукава-выратавальны атрад «Анёл» абвясціў у вышук адразу пяцярых чалавек. Сям'я мінчан у складзе мужа, жонкі і траіх дзяцей выправілася ў адпачынак у Расію на ўласным аўтамабілі. Каля 17 гадзін яны павінны былі перасячы дзяржаўную мяжу, аднак пасля гэтага на сувязь не выходзілі. Блізкія падалі заяву пра прапажу пяцярых чалавек у міліцыю і распачалі пошук.

У выніку сям'ю падарожнікаў усё ж знайшлі, пра гэта паведамляецца на старонцы ПВА «Анёл» у адной з сацыяльных сетак. Пра канкрэтныя прычыны знікнення пакуль нічога невядома. Гаворыцца толькі, што «так склалася, што ў сям'і не было магчымасці паведаміць пра сябе». У атрадзе нагадваюць, што перад далёкімі паездкамі варта загадзя паклапаціцца пра спосаб сувязі з блізкімі.

## РАТАВАЛЬНІКАЎ НА АДПАЧЫНКУ НЕ БЫВАЕ

У канцы мінулага тыдня ў вёсцы Акулінка, што на Мазыршчыне, адбылося непрыемнае здарэнне, пра якое паведамляе Гомельскае абласное ўпраўленне МНС. Ваўчыца (мяркуецца, хворая на шаленства) зайшла на адзін з участкаў і ўкусіла яго гаспадыню — пенсіянерку 1954 года нараджэння. Жанчына на ўласнай машыне дабралася да райцэнтра, дзе ёй была аказана дапамога. Ваўчыца ж кінулася ў бок лесу. Аднак на гэтым жывёла не спынілася.

Тым жа вечарам шэрая драпежніца напала на яшчэ адну пенсіянерку, якая сядзела на лаўцы ў той жа вёсцы. Жанчына пачала крычаць і клікаць дапамогу. Крыкі пачулі суседзі: майстар-выратавальнік Мазырскага аддзела па надзвычайных сітуацыях Аляксандр Альховік і яго бацька, якія адпачывалі на сваім лецішчы. Мужчыны кінуліся на крык і пры дапамозе вілаў і лапаты забілі небяспечную жывёлу. Жанчына 1952 года нараджэння ад шпіталізацыі адмовілася, адправілася дадому пад распіску. Першая ж ахвяра ваўчыцы з ранай правай кісці і адкрытым пераломам другой запясцевай косці шпіталізавана ў траўматалагічнае аддзяленне Мазырскай гарадской бальніцы.

## АТРАКЦЫЁН ЗАБІЎ ЧАЛАВЕКА

Трагедыя здарылася ўчора каля 15 гадзін у сталічным парку Чалюскінцаў. Па папярэдняй інфармацыі, супрацоўнік атракцыёна «Джамба джэт» 1959 года нараджэння паспрабаваў падняць з рэек «амерыканскіх горак» прадмет наведвальнікаў, які ўпаў, і быў насмерць збіты вагончыкам. Па словах відавочцаў, мужчына загінуў на месцы.



Як паведамляюць у прэс-службе ГУУС Мінгарвыканкама, на месцы працавала следчааператыўная група. Прычыны здарэння высвятляюцца. Дарэчы, вясной атракцыён ужо трапляў пад увагу СМІ: тады ў вагончыку падчас яго знаходжання на вялікай вышыні аказаліся заблакаванымі чатыры наведвальнікі.

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.** *lyskavets@zviazda.by*

## ХТО ХУТЧЭЙШЫ НА ВЕЛАСІПЕДЗЕ

**Мінскі абласны веласіпедны тур, прысвечаны 71-й гадавіне Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне, прайшоў днямі ў Крупках. Канцавы пункт прабегу — возера Сялява. На працягу маршруту ўдзельнікі зрабілі прыпынак у вёсках Худаўцы і Прошыка, усклалі кветкі да помніка Героя Савецкага Саюза Алены Колесавай.**

У велапрабегу прынялі ўдзел кіраўніцтва Мінскага аблвыканкама, работнікі яго структурных падраздзяленняў, абласных ведамасных арганізацый, прадстаўнікі раённых і гарадскіх выканкамаў.

Для ўсіх ахвотных былі праведзены спартыўныя спаборніцтвы: паркавы валейбол, дартс, фігурнае ваджэнне веласіпеда, а таксама конкурсы «Кіданне валёнка», «Хто хутчэйшы на мятле?» і іншыя.

Мэта мерапрыемства — папулярызацыя веласіпеднага спорту, прапаганда здаровага ладу жыцця, арганізацыя вольнага часу жыхароў цэнтральнага рэгіёна, прыцягненне іх да рэгулярных заняткаў фізічнымі практыкаваннямі.

**Тацццяна ЛАЗОЎСКАЯ.** *lazovskaya@zviazda.by*

## ФАТАЛЬНЫ ВЫСТРАЛ

**Трагічна скончылася няўдалая спроба палявання ў Маларыцкім раёне. У суботу вечарам 43-гадовы жыхар Брэста быў на рацэ Асіпаўка, недалёка ад вёскі Дарапеевічы. Пры сабе гараджанін меў паляўнічую стрэльбу і дазвол на здабычу вадаплаўнай птушкі. Як ён пазней тлумачыў супрацоўнікам праваахоўных органаў, каля вады пачуў нейкі шорах, убачыў кругі на вадзе, падумаў, што бабёр, і стрэліў. Але трапіў у чалавека. Ад атрыманага ранення 39-гадовы жыхар вёскі Дарапеевічы памёр на месцы.**

Як расказала карэспандэнту газеты афіцыйны прадстаўнік УСК па Брэсцкай вобласці Марына ДРАНЬКОВА, следчыя высветлілі, што гора-паляўнічы, калі ўбачыў вынік свайго выстралу, сеў у машыну і з месца здарэння ўцёк. Затрымалі яго ўжо дома той жа ноччу.

Родныя загінулага патлумачылі, што ў той ракавы вечар мужчына разам са сваякамі ставіў сеткі на рыбу. Вяскоўцы спалохаліся гуку машыны, падумалі, што гэта інспектары рыбаахоўнага ведамства і схаваліся за пагоркам, а галава сям'і чамусьці застаўся ў вадзе. Як аказалася, на сваю бяду.

Маларыцкім раўаддзелам СК заведзена крымінальная справа па ч.1 арт.139 (забойства). Праводзяцца следчыя дзеянні, праводзіцца комплекс судовых экспертыз.

У Брэсцкай абласной інспекцыі аховы жывёльнага і раслiннага свету напомнілі, што недалёка ад гэтага месца ў Маларыцкім раёне два гады таму егер выпадкова застрэліў чалавека, які займаўся незаконным паляваннем. І зноў ігнараванне правілаў і нормаў палявання прывяло да трагедыі.

## ЛАВІЎ ПЯЦЦЮ СЕТКАМІ

**Возера Лукаўскае, што ў Маларыцкім раёне, вядома сваімі маляўнічымі краявідамі. Як аказалася, і браканьеры яго любяць. Аднаго такога затрымалі супрацоўнікі Брэсцкай міжраённай інспекцыі на гэтым тыдні. Кіроўца мясцовай гаспадаркі лавіў рыбу аж пяццю сеткамі, сумарная даўжыня якіх склала 297 метраў. У гэтых снасцях на момант затрымання было 137 рыбін і 11 ракаў.**

Паводле слоў супрацоўніка інспекцыі Ігара КАЛЕНЬКІ, шкода нанесеная навакольнаму асяроддзю, ацэнена ў 3076 рублёў, а кошт незаконна здабытай прадукцыі цягне на 170 рублёў. Вырашаецца пытанне аб узбуджэнні крымінальнай справы.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.** *yackevich@zviazda.by*